**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны фальклорны калектыў «Журавінка» філіял «Слабадскі сельскі дом культуры» ДУ «Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»**

База дзейнасці: філіял «Слабадскі сельскі дом культуры»
ДУ «Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»
Кіраўнік: Забаўка Наталля Мікалаеўна
Год стварэння: 1987
Год надання наймення «народны аматарскі калектыў»: 1992
Год надання звання «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь»: 2002

Фальклорны калектыў «Журавінка» быў створаны на базе, каб падтрымаць багацейшы пласт мясцовай духоўнай народнай культуры. Яго заснавальнікам і кіраўнікам стала Ганна Васільеўна Сакалоўская, якая працавала ў мясцовым калгасе заатэхнікам.

Калектыў складаюць людзі, якіх аб’ядноўвае любоў да спадчыны роднага куточка. Ярка вызначаная этнаграфічнасць гурта ўвесь час прываблівае да сябе гледачоў. Калі спявае гэты цудоўны калектыў, міжволі ўзнікае ўражанне, што быццам бы спявае сама матухна-зямля.

Калектыў спрыяе захаванню ў натуральным асяроддзі атрыманых у спадчыну абрадавых свят «Каляды», «Гуканне вясны», «Юр’я», «Жніво», «Вяселле», адметных веснавых карагодаў, разнастайных народных танцаў, шматлікіх лірычных і жартоўных песень.

Усе спявачкі гурта валодаюць дзівоснай самабытнай манерай выканання народных песень. Хто ўпершыню бачыць «Журавінку», здзіўляецца той невычэрпнай энергіі і запалу жанчын сталага ўзросту, у якіх у душы нібы па жар-птушцы. Кожны выступ калектыву выклікае ў гледачоў прыўзняты, святочны настрой.

Для дасягнення сваёй галоўнай мэты – прапаганды гістарычнай спадчыны і захавання лакальных народных традыцый – калектыў актыўна ўдзельнічае ва ўсіх раённых святах народнай творчасці і святах, прысвечаных знамянальным датам. Усе выступленні калектыву складаюцца з беларускіх народных песень і народных побытавых танцаў мясцовага паходжання. Рэпертуар калектыву ўключае сямейна-абрадавыя (вясельныя, радзінныя), каляндарна-земляробчыя (калядныя, валачобныя, купальскія, юраўскія, жніўныя) і пазаабрадавыя песні, веснавыя і летнія карагоды. З задавальненнем самадзейныя артысты выконваюць гумарыстычныя, жартоўныя песні і прыпеўкі, танцы сваіх бабуль: «Цёмна ночка», «Месяц», «Качан», «Матлёт», «Субота», «Каблучкі» і іншыя. Кожны танец вызначаецца сваім характарам выканання. Адметнае і адзенне ўдзельнікаў калектыву: святочныя, яркія, самабытныя касцюмы зроблены рукамі саміх спявачак паводле лакальных мастацкіх традыцый.

За высокі творчы ўзровень і актыўную прапаганду народнай творчасці калектыў шматразова ўзнагароджваўся граматамі і дыпломамі міжнароднага, рэспубліканскага, абласнога і раённага ўзроўняў.

